МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ**

вул. Ракаўская, д. 17, 220004, г.Мінск
тэл./факс 276 76 54
р/с BY11BLBB36040102395751001001
у Дырэкцыі ААТ «Белінвестбанк»
па г.Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X
uk@minsk.gov.by

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**УПРАВЛЕНИЕ КУЛЬТУРЫ**

ул. Раковская, д. 17, 220004, г.Минск
тел./факс 276 76 54
р/с BY11BLBB36040102395751001001
в Дирекции ОАО «Белинвестбанк»
по г.Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X
uk@minsk.gov.by

08.10.2024 № 1-5/135

на № ____________ ад ______________

[redacted]

Аб разглядзе звароту

[redacted]

Упраўленне культуры Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта разгледзела Ваш калектыўны электронны зварот ад 26.09.2024 № 6-7-1378/12эл.кол, паступіўшы ў Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, па пытанні ўсталявання помніка Паўліне Мядзёлцы і ў рамках кампетэнцыі паведамляе наступнае.

Стварэнне і ўстаноўка твораў манументальнай скульптуры ажыццяўляюцца ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.09.2008 № 1372 (далей – Палажэнне), пры вызначэнні заказчыка і крыніцы фінансавання ўсіх відаў работ, на падставе заключэння Мінскага гарадскога мастацка-экспертнага савета па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву, станоўчага заключэння Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і па рашэнню Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

У адпаведнасці з пунктам 27 артыкула 4 Палажэння фінансаванне стварэння твораў мастацтва можа ажыццяўляцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, сродкаў юрыдычных і (або) фізічных асоб, а таксама з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Пры фінансаванні стварэння твора мастацтва за кошт сродкаў або з прыцягненнем бюджэтных сродкаў для адбору эскізнага праекта праводзіцца конкурс (пункт 13 артыкул 3 Палажэння).

Прыняцце рашэння аб стварэнні манументальнай скульптуры (незалежна ад крыніц фінансавання) ажыццяўляецца пасля атрымання

станоўчага заключэння Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Для прыняцця гэтага рашэння Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь неабходна прадаставіць інфармацыю аб заказчыку, крыніцы і памерах фінансавання, а таксама месцы ўстаноўкі твора мастацтва.

Прымаючы да ўвагі выкладзенае, магчымасць стварэння і ўстаноўкі вышэйназванага твора манументальнай скульптуры можа быць разгледжана пры ўмовах вызначэння заказчыка і крыніц фінансавання.

Дадзены адказ можа быць абскарджаны ў адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц» у вышэйстаячай арганізацыі або ў судовым парадку.

Начальнік упраўлення К.П.Лучына

Лось 372 43 45

Тема **Управление культуры МГИК**

От Отдел искусств управления культуры МГИК <oiuk@minsk.gov.by>

[redacted]

- Аб ўсталяванні помніка Паўліне Мядзёлцы.pdf(~56 КБ)